Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар па вучэбнай рабоце
______________ С.Л. Шпарло
18.05.2023
Рэгістрацыйны № УД-579/эвуч.

# МЕТОДЫКА РАБОТЫ З ХОРАМ

*Вучэбная праграма*
*ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне*
для спецыяльнасці
1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках),
напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01-01
Народная творчасць (харавая музыка),
спецыялізацыі 1-18 01 01-01-02 Харавая музыка народная

2023

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі I ступені па спецыяьнасці 1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках), зацверджанага пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 12 красавіка 2022 г. № 78, вучэбнага плана БДУКМ па напрамку спецыяльнасці

**СКЛАДАЛЬНІК:**

*Л.Л. Ражкова,* загадчык кафедры народна-песеннай творчасці і фальклору ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук.

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*І.А. Змітрукевіч,* выкладчык установы адукацыі «Мінскі дзяржаўны каледж мастацтваў»;

*Т.С. Гажэўская,* дацэнт кафедры харавой музыкі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук, дацэнт.

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

*кафедрай* народна-песеннай творчасці ўстановы адукацыі і фальклору «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 8 ад 29.03.2022);

*навукова-метадычным саветам* установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 4 ад 26.04.22).

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Будучыя кіраўнікі народнага хору павінны ведаць тэарэтычныя асновы методыкі работы з хорам, асаблівасці народна-песеннага выканальніцтва, пытанні хоразнаўства, а таксама валодаць пэўнымі навыкамі і ўменнямі дырыжорска-хормайстарскай і педагагічнай працы, якая прадугледжвае: засваенне тэарэтычных пытанняў па гісторыі, станаўленні і развіцці аматарскай творчасці і народна-песеннага выканальніцтва ў Беларусі, вывучэнне пытанняў аб асноўных кірунках навучання і захавання беларускага песеннага фальклору.

Вучэбная дысцыпліна «Методыка работы з хорам» узаемазвязана з такімі вучэбнмі дысцыплінамі, як «Харавы клас», «Дырыжыраванне», «Хоразнаўства», «Пастаноўка голасу» і абапіраецца на грунтоўныя веды ўменні і навыкі гэтых вучэбных дысцыплін.

Засваенне вучэбнай дысцыпліны дазволіць сфарміраваць наступныя групы кампетэнцый:

– АК-1. Умець выкарыстоўваць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і творчых задач.

– АК-2. Валодаць сістэмным і параўнальным аналізам.

– АК-3. Валодаць даследчымі навыкамі.

– АК-4. Умець працаваць самастойна.

– САК-10. Фармаваць і аргументаваць уласныя меркаванні і прафесійную пазіцыю.

– ПК-1. Ствараць творчыя калектывы.

– ПК-5. Карыстацца інфармацыйнымі рэсурсамі для шматбаковага забеспячэння арганізацыйна-кіраўніцкай дзейнасці ў галіне народнай творчасці.

– ПК-7. Планаваць працэс навучання і выхавання ў адпаведнасці з распрацаванымі нарматыўнымі і дыдактычнымі дакументамі.

– ПК-14. Аналізаваць перспектывы і напрамкі захавання і развіцця народнай творчасці.

– ПК-24. Працаваць з крыніцамі рэпертуару, літаратурай па народнай творчасці

– ПК-25. Арганізоўваць этапы працэсу выканання мастацкіх (музычных) твораў для эстэтычнага выхавання і фарміравання высокамастацкіх густаў насельніцтва.

– ПК-28. Самастойна падбіраць рэпертуар, фарміраваць канцэртную праграму.

*Мэта* вучэбнай дысцыпліны – даць будучаму спецыялісту неабходныя веды па пытаннях методыкі работы і кіравання народным хорам і фальклорным калектывам на аснове дасягненняў тэорыі і практыкі ў сферы народна-песенных традыцый і хоразнаўства.

Асноўныя *задачы* вучэбнай дысцыпліны:

– спрыяць асэнсаванню ролі і месца народных хароў і фальклорных калектываў у сістэме сучаснай мастацкай культуры;

– пазнаёміць студэнтаў са спецыфікай хормайстарскай работы ў народным хоры і фальклорным песенным калектыве, раскрыць творчы характар яго дзейнасці;

– прывіць трывалыя веды па пытаннях методыкі вакальнай работы ў фальклорным гурце;

– сфарміраваць у будучых спецыялістаў мастацка-каштоўнасную арыентацыю па авалодванні прынцыпамі падбору рэпертуару і ўменні максімальна выкарыстоўваць яго ў выхаваўчай і вучэбна-педагагічнай рабоце.

Выпускнік павінен *ведаць:*

– прынцыпы стварэння харавога калектыву,

– вакальна-харавую структуру хору,

– прынцыпы фарміравання канцэртнага рэпертуару,

– методыку распявання ў харавым калектыве.

*умець:*

– распяваць харавы калектыў,

– працаваць над партытурай,

– праводзіць рэпетыцыйныя заняткі з харавым калектывам,

– арганізаваць вучэбна-выхаваўчую работу.

*валодаць:*

– трывалымі ведамі этапаў, метадаў і сродкаў арганізацыі народнага хора ці фальклорнага гурта, разуменнем жанрава-відавой і стылявой яго разнастайнасці;

– спецыфікай хормайстарскай работы ў народным хоры і фальклорным песенным калектыве;

– методыкай вакальнай работы ў фальклорным гурце і народным хоры;

– навыкамі арганізацыі вучэбна-выхаваўчай работы ў народным хоры і фальклорным песенным калектыве.

У адпаведнасці з тыпавым вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Методыка работы з хорам» адведзена 88 гадзін, з якіх 34 – аўдыторныя ( 22 – лекцыі і 6 - семінарскія) заняткі.

Рэкамендуемая форма кантролю – экзамен.

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛА

## Уводзіны

Мэта і задачы вучэбнай дысцыпліны «Методыка работы з хорам». Сувязь з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі. Роля вучэбнай дысцыпліны ў падрыхтоўцы спецыяліста вышэйшай кваліфікацыі. Вучэбна-метадычнае забеспячэнне дадзенай вучэбнай дысцыпліны.

## Р а з д з е л 1. Аматарская творчасць у сістэме сучаснай духоўнай культуры

### *Тэма 1. Гісторыя станаўлення і развіцця аматарскай народна-песеннай творчасці і асноўныя прынцыпы работы з народным хорам*

Аматарская народна-песенная творчасць як адзін са значных элементаў у сістэме нацыянальнай мастацкай культуры. Харавыя спевы як від мастацтва. Задачы і функцыі аматарскай народна-песеннай творчасці. Гісторыя станаўлення і развіцця народных хароў і фальклорных гуртоў. Фарміраванне народнага пеўчага калектыву. Спецыфічныя рысы інтэрпрэтацыі фальклору на розных этапах развіцця аматарскай творчасці. Носьбіты фальклорных традыцый. Канцэртна-выканальніцкая дзейнасць, накіраваная на прапаганду народна-песенных традыцый, развіццё мастацкага густу і творчых здольнасцей удзельнікаў калектыву. Характарыстыка і творчы напрамак сучасных аматарскіх і прафесійных народных хароў і фальклорных гуртоў.

### *Тэма 2. Методыкі навучання народнай манеры спеваў. Сучасныя навуковыя даследаванні ў сферы народна-песеннага гукаўтварэння. Стварэнне народнага хору і арганізацыя яго творчай работы*

Стан падрыхтоўкі кіраўнікоў народна-песенных і фальклорных калектываў у музычных установах краіны. Асноўныя даследаванні па вывучэнні механізма гучання народнага голасу. Метадычныя распрацоўкі Л. Л. Хрысціянсана, Н. К. Мяшко, У. М. Шчурава, А. С. Кабанава, Д. У. Пакроўскага, Н. В. Калугінай і інш. Характарыстыка мясцовых вакальных школ. Навуковыя дасягненні беларускіх фальклarыстаў З. Я. Эвальд, З. Я. Мажэйкі, Р. Р. Шырмы, Г. І. Цітовіча, Т. Б. Варфаламеевай, У. І. Раговіча і інш. Сучасныя метадычныя распрацоўкі па авалоданні народнай манерай спеваў.

Падрыхтоўчы перыяд стварэння народнага хору. Праверка музыкальных даных: слыху, голасу, рытму, музычнай памяці, артыстычнасці. Камплектаванне народнага хору. Выбар творчага кірунку і вызначэнне задач. Пачатковы этап работы калектыву. Арганізацыя заняткаў і рэпетыцыйнай работы.

### *Тэма 3. Рэгіянальныя гаворкі і іх уплыў на народную манеру спеваў*

Спевы і мова. Гутарковая аснова народных спеваў. Моўныя інтанацыі і выканальніцкія прыёмы. Агульная характарыстыка паўночна-ўсходняга і паўднёва-заходняга дыялектаў. Разнастайнасць беларускіх гаворак; акаючыя, окаючыя, экаючыя, ыкаючыя гаворкі. Уплыў рэгіянальных гаворак на народную манеру выканання. Зычныя гукі. Спецыфіка ўтварэння галосных і зычных гукаў пры спевах.

### *Тэма 4. Асноўныя прынцыпы засваення тэхналогіі народна-песеннага выканальніцтва*

Этапы засваення народна-песенных традыцый у навучальным працэсе. Агульнадыдактычныя і спецыяльныя прынцыпы засваення народнай манеры спеваў. Прынцып развіцця галасавых і творчых здольнасцей. Прынцып слыхавога ўспрымання і пераймання спеваў. Прынцып тэхнічных і мастацкіх асаблівасцей. Прынцып мэтанакіраванай працы кіравання голасам. Прынцып выхавання і ўсебаковага развіцця асобы спевака. Прынцып індывідуальнага падыходу, бесперапыннасці і сістэматычнасці ў навучанні. Калектыўны характар навучання ў народным хоры.

## Р а з д з е л 2. Методыка вакальна-педагагічнай работы ў народным хоры і фальклорным гурце

### *Тэма 5. Вакальна-харавая структура народнага хору і фальклорнага калектыву*

Рэгістры народнага голасу. Расстаноўка галасоў у народным хоры і фальклорных гуртах. Дыяпазон галасоў у народна-песенных калектывах.

### *Тэма 6. Методыка засваення пеўчага дыхання і апоры гуку. Працэс гукаўтварэння*

Песенная ўстаноўка. Даследаванні працэсу дыхання. Тыпы дыхання. Фазы дыхання. Механізм працэсу дыхання пры спевах. Апора дыхання. Фарсіраванае дыханне. Ланцуговае дыханне. Атака гуку і яе практычнае ўжыванне. Практыкаванні для ўстаноўкі правільнага дыхання ў спевах. Высокая пазіцыя гуку. Адзіная манера спеваў і метады работы над ёй.

### *Тэма 7. Дыкцыя і метады работы над дыкцыяй*

Дыкцыя як галоўны сродак данясення тэксту твора і раскрыцця мастацкага вобраза. Выяўленне прычын дрэннай дыкцыі. Характарыстыка галосных гукаў беларускай мовы. Тэхніка ўтварэння галосных у спевах. Характарыстыка зычных гукаў і тэхніка іх утварэння ў спевах. Практыкаванні для выпраўлення і ўдасканалення дыкцыі і артыкуляцыі.

### *Тэма 8. Сістэма распявання і яго задачы*

Сістэма распявання як асноўнае звяно школы народных спеваў. Мэты і задачы распявання. Засваенне тэхнікі спеваў народнага голасу. Віды гукавядзення. Практыкаванні па выпрацоўцы розных відаў гукавядзення. Тыпы і віды практыкаванняў. Станоўчыя і адмоўныя прыметы гучання голасу. Асноўныя недахопы ў гукавядзенні. Цэласны размоўны спосаб спеваў. Трыадзінства мастацтва спеваў.

### *Тэма 9. Работа над элементамі харавой гучнасці*

Харавы строй (меладычны і гарманічны). Метады работы над правільнай інтанацыяй. Прыметы стройных спеваў. Харавы ансамбль. Віды і тыпы ансамбляў. Асноўныя метады работы над ансамблем у народным хоры і фальклорным гурце.

### *Тэма 10. Музычна-выразныя сродкі і метады работы над стварэннем мастацкага вобраза*

Паняцце музычна-харавой выразнасці. Метрарытм і тэмп. Тэмбр і яго ўплыў на стварэнне мастацкага вобраза песні. Дынаміка, асноўныя дынамічныя адценні і работа над імі. Фразіроўка і яе залежнасць ад тэксту твора. Музычная форма. Музычна-вобразнае мысленне. Метады авалодвання музычнай партытурай.

### *Тэма 11. Фарміраванне рэпертуару беларускага народнага хору і фальклорнага гурту*

Рэпертуар як дзейсны сродак мастацка-эстэтычнага выхавання ўдзельнікаў калектыву, творчы твар калектыву. Прынцыпы падбору рэпертуару, разнастайнасць яго тэматыкі, жанраў. Адпаведнасць рэпертуару выканальніцкаму кірунку калектыву, даступнасць яго вакальна-тэхнічнаму ўзроўню. Узоры аўтэнтычнага фальклору, апрацоўкі народных песень, аўтарскія творы для народна-песеннага калектыву.

Канцэртныя выступленні як шлях да прафесійнага росту народна-песенных калектываў. Складанне рэпертуару для святочных, тэматычных і справаздачных канцэртаў і арганізацыя канцэртнай дзейнасці народнага хору.

### *Тэма 12. Пастановачная работа ў народным хоры і фальклорным гурце*

Вызначэнне жанру і характару твора ў залежнасці ад яго сцэнічнага рашэння і элементаў руху.

Характарыстыка асноўных груп твораў: гульнёвыя (гульні), карагодныя (карагоды), танцавальныя (танцы) і распазнавальныя асаблівасці гэтых груп.

Выхаванне сцэнічнай культуры ўдзельнікаў, навыкаў сцэнічнага руху, акцёрскай гульні і народнай харэаграфіі. Знаёмства з беларускімі абрадамі, якія патрабуюць сцэнічнага ўвасаблення.

Авалодванне асноўнымі элементамі беларускіх народных танцаў, карагодаў, гульняў. Выхаванне вобразнага мыслення, граматнага падыходу да выканання разнастайных па жанрах песень.

### *Тэма 13. Інструментальнае суправаджэнне ў беларускім народным хоры і фальклорным ансамблі*

Значэнне музычнага суправаджэння ў рабоце харавога калектыву. Фальклорныя традыцыі ў выкарыстанні народных інструментаў і акампаніруючых саставаў. Беларускія народныя інструменты: духавыя, смычковыя, ударныя, гармонікі і інш.

Арганічная ўзаемасувязь вакальна-харавога і інструментальнага выканання як неабходная ўмова творчага росту народнапесенных калектываў.

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

| Раздзелы і тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|
| | Лек-цый-ныя | Семі-нарс-кія | УСР | |
| **Уводзіны** | 1 | | | |
| **Р а з д з е л 1. Аматарская творчасць у сістэме сучаснай духоўнай культуры** | | | | |
| *Тэма 1.* Гісторыя станаўлення і развіцця аматарскай народна-песеннай творчасці і асноўныя прынцыпы работы з народным хорам | 1 | | | |
| *Тэма 2.* Методыкі навучання народнай манеры спеваў. Сучасныя навуковыя даследаванні ў сферы народна-песеннага гукаўтварэння. Стварэнне народнага хору і арганізацыя яго творчай работы | 2 | | | |
| *Тэма 3.* Рэгіянальныя гаворкі і іх уплыў на народную манеру спеваў | 1 | | | |
| *Тэма 4.* Асноўныя прынцыпы засваення тэхналогіі народна-песеннага выканальніцтва | 1 | | 2 | пісьмо-вая работа |
| **Р а з д з е л 2. Методыка вакальна-педагагічнай работы ў народным хоры і фальклорным гурце** | | | | |
| *Тэма 5.* Вакальна-харавая структура народнага хору і фальклорнага калектыву | 2 | | | |
| *Тэма 6.* Методыка засваення пеўчага дыхання і апоры гуку. Працэс гукаўтварэння | 2 | 2 | | |
| *Тэма 7.* Дыкцыя і метады работы над дыкцыяй | 2 | 2 | | |
| *Тэма 8.* Сістэма распявання і яго задачы | 2 | 2 | | |
| *Тэма 9.* Работа над элементамі харавой гучнасці | 2 | | 2 | пісьмо-вая работа |
| *Тэма 10.* Музычна-выразныя сродкі і метады работы над стварэннем мастацкага вобраза | 2 | | | |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| *Тэма 11.* Фарміраванне рэпертуару беларускага народнага хору і фальклорнага гурту | 2 | | | |
| *Тэма 12.* Пастановачная работа ў народным хоры і фальклорным гурце | 1 | | | |
| *Тэма 13.* Інструментальнае суправаджэнне ў беларускім народным хоры і фальклорным ансамблі | 1 | | 2 | пісьмо-вая работа |
| **Усяго: 34** | 22 | 6 | 6 | |

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

### *Асноўная*

1. *Грамовіч, І. М.* Методыка работы з фальклорным гуртом : курс лекцый / І. М. Грамовіч, Л. В. Снапкова. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2009. – 139 с.

2. *Дмитриев, Л. Б.* Основы вокальной методики / Л. Б. Дмитриев. – М. : Музыка, 2000. – 367 с.

3. *Калугина, Н. В.* Методика работы с русским народным хором : учебник для муз. вузов / Н. В. Калугина. – М. : Музыка, 1977. – 255 с.

4. *Малышева, Н. М.* О пении: из опыта работы с певцами / Н. М. Малышева. – М. : Сов. композитор, 1988. – 135 с.

5. *Руднева, А. В.* Русский народный хор и работа с ним / А. В. Руднева. – М. : Сов. Россия, 1960. – 49 с.

6. *Самарин, В. А.* Хороведение : учеб. пособие для студ. сред. муз.-пед. учеб. заведений / В. А. Самарин. – М. : Академия, 1998. – 208 с.

7. *Шамина, Л. В.* Работа с самодеятельным хоровым коллективом / Л. В. Шамина. – М. : Музыка, 1983. – 175 с.

### *Вучэбна-метадычная*

1. *Вопросы* вокальной педагогики : сб. ст. – М. : Гос. муз. изд-во, 1962. – Вып. 1. – 147 с.

2. *Крывіцкі, А. А.* Сучасная беларуская літаратурная мова і народныя гаворкі / А. А. Крывіцкі ; Т-ва па распаўсюджанні паліт. і навук. ведаў БССР. – Мінск, 1961. – 40 с.

3. *Медведева, М.* Методика хоровой аранжировки для руководителей фольклорных песенных коллективов / М. Медведева. – М. : ВНМЦ и КПР, 1982. – 87 с.

4. *Менабени, А. Г.* Методика обучения сольному пению : учеб. пособие для пед. ин-тов / А. Г. Менабени. – М. : Просвещение, 1987. – 93 с.

5. *Огороднов, Д. Е.* Воспитание певца в самодеятельном ансамбле / Д. Е. Огороднов. – Киев : Муз. Украина, 1989. – 66 с.

6. *Савельева, В. П.* Проблемы вокального обучения руководителей народных хоров / В. П. Савельева // Вопросы хорового образования : сб. тр. / М-во культуры РСФСР, Гос. муз.-пед. ин-т. – М., 1985. – Вып. 77. – С. 120–125.

7. *Стулова, Г.П.* Хоровое пение. Методика работы с детским хором: учебное пособие /Г.П. Стулова. – 2-е изд., стер. – Санкт-Петербург, издательство «Лань», издательство «Планета музыки», 2016. – 176 с.

8. *Холупава, Л. І.* Пастаноўка голасу і вакальны ансамбль : вучэб. дапам. / Л. І. Холупава, І. М. Грамовіч, Л. Л. Ражкова. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2008. – 189 с.

*Дадатковая*

1. *Беларускі* фальклор у сучасных запісах. Традыцыйныя жанры. Гомельская вобласць / уклад. В. А. Захарава, Р. М. Кавалёва, В. Д. Ліцвінка. – Мінск : Універсітэцкае, 1989. – 384 с.

2. *Беларускі* фальклор у сучасных запісах. Традыцыйныя жанры. Мінская вобласць / уклад. В. Д. Ліцвінка, Г. Д. Кутырова. – Мінск : Універсітэцкае, 1995. – 250 с.

3. *Варфаламеева, Т. Б.* Песні Беларускага Панямоння / Т. Б. Варфаламеева. – Мінск : Беларус. навука, 1980. – 220 с.

4. *Вянок* беларускіх народных песень / запіс У. Раговіча. – Мінск : Навука і тэхніка, 1988. – 432 с.

5. *Елатов, В. И.* Песни восточнославянской общности / В. И. Елатов. – Минск : Наука и техника, 1977. – 245 с.

6. *Емельянов, В. В.* Фонопедический метод формирования певческого голосообразования / В. В. Емельянов. – Новосибирск : Наука. Сибирское отд., 1991. – 39 с.

7. *Мажэйка, З. Я.* Песні Беларускага Паазер'я / З. Я. Мажэйка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1981. – 493 с.

8. *Мешко, Н. К.* Искусство народного пения : практ. руководство и методика обучения искусству народного пения / Н. К. Мешко. – М. : ЛУЧ, 2000. – Ч. 2. – 80 с.

9. *Можейко, З. Я.* Песни Белорусского Полесья / З. Я. Можейко. – М. : Сов. композитор, 1983. – Вып. 1. – 184 с.

10. *Можейко, З. Я.* Песни Белорусского Полесья / З. Я. Можейко. – М. : Сов. композитор, 1984. – Вып. 2. – 181 с.

11. *Мажэйка, З. Я.* Песні Беларускага Падняпроўя / З. Я. Мажэйка, Т. Б. Варфаламеева. – Мінск : Беларус. навука, 1999. – 276 с.

12. *Раговіч, У. І.* Песенны фальклор Палесся. Песні святочнага календара / У. І. Раговіч. – Мінск : Чатыры чвэрці, 2001. – Т. 1. – 526 с.

13. *Традыцыйная* мастацкая культура беларусаў : у 6 т. / уклад. Т. Б. Варфаламеева. – Мінск : Беларус. навука, 2001. – Т. 1: Магілёўскае Падняпроўе. – 796 с.

## Рэкамендуемыя сродкі дыягностыкі

З мэтай кантролю якасці навучання і забеспячэння фарміравання комплексу прафесійнай кампетэнцыі студэнта выкарыстоўваюцца наступныя сродкі дыягностыкі:

–тэсты па асобных раздзелах вучэбнай дысцыпліны;

– вуснае апытванне;

– падрыхтоўка рэферата;

– выступленне студэнтаў з дакладамі на навуковых канферэнцыях па тэмах вучэбнай дысцыпліны;

– практычны паказ;

– экзамен.

## Метадычныя указанні па арганізацыі самастойнай работы студэнтаў

Самастойная работа студэнтаў з'яўляецца часткай вучэбнай дзейнасці і мае мэтай паглыбленне і замацаванне атрыманых кампетэнцый, самастойны пошук і набыццё новых ведаў. Прызвана садзейнічаць фарміраванню навыкаў самастойнай работы ў вучэбнай, прафесійнай і навуковай дзейнасці студэнта.

Самастойная работа студэнтаў прадугледжвае работу з лекцыйным матэрыялам, вучэбна-метадычнымі выданнямі, навуковымі крыніцамі, пошук і аналіз дадатковай літаратуры па тэмах дысцыпліны, вывучэнне тэм, якія вынесены на самастойную падрыхтоўку, падрыхтоўку да залікаў і экзаменаў па дысцыпліне.

## Тэхналогіі навучання

У ліку эфектыўных педагагічных тэхналогій, якія садзейнічаюць развіццю ў студэнтаў крытычнага мыслення, вопыту фарміравання і выкарыстання інструментарыю вучэбна-даследчай дзейнасці, ролевага і імітацыйнага мадэліравання, магчымасці творча засвойваць новы вопыт пошуку і вызначэння студэнтамі асобасных сэнсаў і каштоўнасных адносін, вылучаюцца:

– тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці,

– камунікатыўныя тэхналогіі (дыспуты, дыскусіі, прэс-канферэнцыі і інш.),

– гульнёвыя тэхналогіі (дзелавыя, ролевыя і інш.).